■ Надвор'е

# СПЯКОТА І ДАЖДЖЫ

## У сераду на поўдні краіны – да плюс 36

**На тэрыторыю краіны рухаюцца сур'ёзныя атмасферныя франты, якія ўжо прынеслі ў Беларусь навальніцы і дажджы рознай інтэнсіўнасці, паведамляюць спецыялісты Белгідрametэацэнтра.**

Такім чынам, з паўднёва-заходнімі вятрамі да нас будуць паступаць цёплыя вільготныя паветраныя масы міжземнаморскага паходжання, што прывядзе да павышэння тэмпературнага фону.

Па паўночна-заходняй палове краіны кароткачасовыя дажджы чакаюцца ў сераду. У асобных раёнах прагназуюцца навальніцы і моцныя дажджы, а ўдзень пры навальніцах узмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с, магчымы град. Мінімальная тэмпература паветра ўначы будзе плюс 14—20 градусаў, па поўдні — да 22 цяпла. Удзень пачне прыпякаць сур'ёзна, калі максімальная тэмпература будзе дасягаць плюс 25—32 градусаў, а па паўднёвым усходзе — да 33—36 цяпла, у паўночна-заходніх раёнах — плюс 19—24 градусы.

У чацвер уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы, а ўдзень месцамі моцныя дажджы. Даволі камфортная тэмпература паветра будзе ўначы — 12—19 цяпла, а максімальная ўдзень — плюс 19—26 градусаў. Яшчэ цяплей прагназуецца па паўднёвым усходзе краіны, дзе ўначы чакаецца 20—22 цяпла, а ўдзень — плюс 27—34 градусы.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пятніцу ўначы пераважна па заходняй палове пройдуць дажджы, у асобных раёнах — моцныя дажджы. Удзень кароткачасовыя дажджы толькі месцамі. У асобных раёнах магчымы навальніцы. Уначы чакаецца плюс 15—22 градусы, удзень — ад 16—20 цяпла па захадзе да плюс 30—34 градусаў па ўсходзе краіны.

### Плануйце далёкія паездкі на раніцу ці на вечар

З-за спёкі Дзяржаўтаінспекцыя і медыкі настойліва раяць кіроўцам кантраляваць сваё самаадчуванне падчас руху, доўга не сядзець за рулём і планаваць далёкія паездкі на раніцу ці вечар. Варта таксама праверыць, ці ёсць у машыне вогнетушыцель. Абавязкова бярыце з сабой пітную ваду і неабходныя лекі.

У ДАІ нагадваюць: падчас дажджоў значна зніжаецца счапленне колаў, што можа прывесці да страты кіруемасці і павелічэння тармазнога шляху. У выніку руху цяжкавагавых аўтамабіляў таксама адбываецца дэфармацыя пакрыцця. На ім з'яўляецца каляіна, няроўнасці, што таксама зніжае кіруемасць аўто. Асабліва на высокай хуткасці.

Пры моцным дажджы трэба абавязкова ўключыць блізкае святло фар ці габарытныя агні. Не трэба з'язджаць на абочыну. Прасачыце, каб усе пасажыры ў аўтамабілі былі прышпіленыя рамянямі бяспекі, а дзеці ва ўзросце да 12 гадоў абавязкова сядзелі ў аўтакрэслах.

**Сяргей КУРКАЧ, Тарас ШЧЫРЫ**

■ Класныя навіны

# НА ЎРОК ПРАЦЫ — ПА КАРЫСНЫЯ НАВЫКІ

## Школьнікаў будуць вучыць рамантаваць мэблю, электрапрыборы і... прымаць гасцей

**Пра гэта ішла размова падчас «круглага стала», які прайшоў у прэс-цэнтры БЕЛТА. Мерапрыемства было прысвечана падрыхтоўцы да новага навучальнага года і Рэспубліканскага педагагічнага савета, які адбудзецца ў апошнія дні жніўня.**


Фота Канстанціна ДРОБАВА

### Умовы для профільных класаў

У Беларусі ўжо распрацаваны новыя праграмы па ўсіх вучэбных прадметах з 1 па 11 клас. Яны будуць уводзіцца паэтапна. **Уся ж лінейка будзе ўведзена ў 2021/2022 навучальным годзе.** Гэтую інфармацыю паведаміў **дырэктар Нацыянальнага інстытута адукацыі Сяргей ВАЖНІК**.

Ён расказаў, што ў новых праграмах зменшаны аб'ём тэарэтычнага матэрыялу, выключана складаная тэрміналогія, змест адаптаваны да ўзроставых асаблівасцяў вучняў. «Усе праграмы перагледжаюцца з пункту гледжання іх пераемнасці і ўпершыню — з пункту гледжання захавання міжпрадметных сувязяў. Узмоцнена практыка-арыентаваная накіраванасць праграм пры захаванні іх фундаментальнасці і сістэмнасці», — патлумачыў Сяргей Важнік.

Па новых праграмах у наступным навучальным годзе будуць працаваць першыя, другія, пятыя, шостыя, дзясятыя і адзінаццатыя класы.

У 2015/2016 навучальным годзе профільныя класы працавалі ў 1118 установах сярэдняй агульнай адукацыі, а прадметы на павышаным узроўні вывучалі 29 тысяч дзесяцікласнікаў (37% ад агульнай колькасці). Колькі будзе дзейнічаць профільных класаў у новым навучальным годзе, пакуль невядома. Гэта інфармацыя з'явіцца толькі ў жніўні.

— Але мы ні ў якім разе не збіраемся рабіць акцэнт на іх колькасці, — падкрэсліве **намеснік міністра адукацыі Раіса СІДАРЭНКА**. — Профільныя класы будуць адкрывацца толькі там, дзе створана адпаведная матэрыяльная база і маюцца кваліфікаваныя кадры.

— Патрабаванні, што прад'яўляюцца да настаўнікаў, якія працуюць у профільных класах, даволі жорсткія. У профільных класах не можа выкладаць настаўнік другой катэгорыі: толькі першай ці вышэйшай катэгорыі альбо настаўнік-метадыст, — праінфармавала Раіса Сідарэнка. — Дарэчы, каля 70% педагагаў лічаць сябе гатовымі да рэалізацыі профільнага навучання.

### Інфарматыка для пачаткоўцаў

У наступным навучальным годзе ў беларускіх школах з'явіцца новы факультатыў па інфарматыцы для вучняў другога класа — ён пачне выкладацца з другога паўгоддзя. Пра гэта паведаміла на «круглым стале» **намеснік дырэктара адукацыйнага цэнтра Парка высокіх тэхналогій Ірына ВАСІЛЬЕВА**.

«Асноўная мэта факультатыўных заняткаў па інфарматыцы — гэта фарміраванне ўменняў у вучняў, якія дапамогуць ім мець справу з камп'ютарам. Акрамя ўсяго іншага, мы робім стаўку на развіццё ў навучэнцаў творчых здольнасцяў, выкарыстоўваючы спецыяльнае аб'ектна-арыентаванае асяроддзе, якое будзе спрыяць больш глыбокаму замацаванню вучэбнага матэрыялу», — расказала Ірына Васільева.

Што тычыцца выкладання ў школе працоўнага навучання, то, як абяцаюць спецыялісты, праграмы па гэтай школьнай дысцыпліне стануць больш практыка-арыентаванымі.

— Напрыклад, у напрамак «Тэхнічная праца» быў уведзены такі раздзел, як рамонтныя работы ў быце. Школьнікаў навучаць рамантаваць мэблю, сталярную фурнітуру, карыстацца ручным інструментам, займацца рамонтам электрычнага абсталявання, — расказала **метадыст вышэйшай катэгорыі па працоўным навучанні і чарчэнні Мінскага гарадскога інстытута развіцця адукацыі Валянціна ШАРАПАВА.** — Па напрамку «Абслуговая праца» таксама ўлічылі пажаданні настаўнікаў і бацькоў. Дзяўчынак навучаць прыгатаванню страў, асновам хатняй гаспадаркі. Аднак мы рыхтуем не толькі гаспадыню, але і гаспадара. Таму навучым усіх, хто пажадае, як сервіраваць стол, як правільна падаваць стравы і прымаць гасцей і іншым не менш карысным у жыцці навыкам.

Варыятыўнасць праграмы дазваляе настаўніку выбраць той матэрыял, які цікавы вучню, і праводзіць заняткі з улікам наяўнага абсталявання.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# ЦЯГНІК ПАЙШОЎ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Праўда, гэтым правам скарысталіся далёка не ўсе. Сёння мы маем папярэднюю інфармацыю па такіх кватэрах толькі па двух рэгіёнах: па Мінску і Гомельскай вобласці. Паводле апошніх звестак **кіраўніка прэс-службы міністэрства ЖКГ Генадзя АКСЦІЛОВІЧА**, за апошнія два тыдні чэрвеня апошнім шанцам у сталіцы скарысталіся 4100 чалавек, а на Гомельшчыне — 1625 грамадзян, якія падалі адпаведныя заявы на прыватызацыю ў службы «аднаго акна» мясцовай адміністрацыі. Нагадаю, што да гэтага часу ў Мінску заставаліся непрыватызаванымі каля 19 тысяч кватэр. Пра астатнія рэгіёны сёння казаць пакуль зарана, але папярэдняя інфармацыя сведчыць аб тым, што ў краіне застанецца непрыватызаванымі не менш як 140 тысяч кватэр дзяржаўнага жыллёвага фонду.

Такім чынам, пакуль, менавіта ў «час тэхнічнай часткі прыватызацыі» — ад рашэння аб перадачы жылога памяшкання ва ўласнасць грамадзяніну да натарыяльнага афармлення дагавора куплі-продажу (прыватызацыі) — плацiць арэнду за пражыванне вымушаны будуць жыхары прыкладна 155 тысяч кватэр.

### Мясцовыя каэфіцыенты — ад 1,5 да 0,1

Варта адзначыць, што арандаваць жыллё ў дзяржавы тым, хто прахыў у ім не адзін дзясятак гадоў, будзе значна танней, чым здымаць падобную кватэру па поўнай камерцыйнай цане. Давайце разбяромся, як будзе налічвацца плата за арэнднае жыллё?

Самая дарагая арэнда будзе ў Мінску, дзе прадугледжана сістэма каэфіцыентаў у залежнасці ад планава-эканамічных зон. У першай зоне (Цэнтральны раён) ён складае 1,5, а ў пятай (Калядзічы, Шабаны, Сосны, Сокал і Сцяпянка) — 0,5. Гэты каэфіцыент ужываецца да базавай стаўкі (4 рублі 20 капеек за квадратны метр), а да кошту найму прадугледжаны паніжальны каэфіцыент 0,2. Такім чынам, **максімальная стаўка арэнды двухпакаёвай кватэры (48 квадратных метраў) у Цэнтральным раёне складзе 60 рублёў 48 капеек** (604 800 рублёў старымі), а мінімальная — 20 рублёў 16 капеек у пятай планава-эканамічнай зоне.

У рэгіёнах мясцовыя каэфіцыенты да базавай стаўкі вагаюцца ад 0,6—0,8 у абласных цэнтрах да 0,1 у населеных пунктах з насельніцтвам да 1 тысячы чалавек. Акрамя таго, тут на агульную суму арэнды дзейнічае паніжальны каэфіцыент 0,1, а не 0,2 — як у Мінску. Напрыклад, у Магілёве і Бабруйску арэнда двухпакаёвай кватэры (48 «квадратаў») складзе 16 рублёў 13 капеек (161 280 старых рублёў), **а ў маленькім пасёлку** гэтага рэгіёна — **2 рублі 16 капеек**.

### Умовы растэрміноўкі — абавязковыя для выканання

Калі людзі напісалі заяву на прыватызацыю кватэры, то павінны разумець, што далейшая працэдура каштуе грошай. Ёсць варыянт, калі можна ўнесці першапачатковы ўзнос у памеры 10% ад кошту жылля, а астатняе пагашаць часткамі на працягу 40 гадоў, паведамляюць эксперты міністэрства ЖКГ. Разам з тым, яны нагадваюць, што да пагашэння растэрміноўкі распараджацца кватэрай нельга, а ў выпадку нявыплаты ўзносаў дагавор прыватызацыі будзе скасаваны. А вось пасля канчатковага разліку гэтыя абмежаванні будуць зняты.

### З арэндай лепш не жартаваць

Спецыялісты ЖКГ нагадваюць нам, што арэнднае жыллё так і застанецца арэндным нават праз 40 гадоў. Такую нерухомасць нельга прадаць, перадаць па спадчыне, здаць у паднаём.

Дарэчы, адмова ад заключэння дагавора не вызваляе ад платы за карыстанне жылым памяшканнем. Мясцовыя органы ўлады абавязаны пасля 1 ліпеня прапанаваць грамадзяніну афіцыйна аформіць новыя эканамічныя адносіны, і нават у выпадку яго нязгоды рахунак за пражыванне выстаўляецца ва ўстаноўленым парадку. А алгарытм працы з неплацельшчыкамі вядомы. Праўда, у адрозненне ад прыватызаваных кватэр санкцыі да іх значна больш жорсткія. Арэнднага жылля можна пазбавіцца ўжо пры запазычанасці тэрмінам у два месяцы. Прычым наймальнік можа быць выселены без прадастаўлення іншага памяшкання. А гэта ўжо сапраўды сур'ёзна.

### Каму можна і не плаціць

А вось маламаёмасным грамадзянам, хто вырашыць перавесці ў ліпені арэндную кватэру ў сацыяльную, плацiць дзяржаве не давядзецца. Гэтай магчымасцю, напрыклад, магуць скарыстацца адзінокія пенсіянеры, ветэраны і інваліды Вялікай Айчыннай вайны, інваліды І і ІІ групы, шматдзетныя сем'і, а таксама маці, якім прысвоена званне «Маці-гераіня», і іншыя. Больш падрабязна пра гэтыя катэгорыі гаворыцца ва Указе кіраўніка дзяржавы №563.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Рэха фестывалю

# «БЕЗ АЎЦЮКОЎ, ЯК ЦЕНЬ — ХАДЗІЎ У ВЕЧНАЙ СКРУСЕ...»

**Гэта ўжо гісторыя: надоечы, восьмага ліпеня, на раздарожжы паміж Малымі і Вялікімі Аўцюкамі адкрыўся восьмы Усебеларускі фестываль народнага гумару. Факт: яны, тыя Аўцюкі — вялікія і малыя (іх яшчэ завуць аўцюкочанятамі) прызнаны восьмым цудам свету — пасля пірамід Хеопса, Александрыйскага маяка, вісячых садоў Семіраміды, статуі Зеўса...**


Фота Васіля МІНІНА

Як Бог на небе: ёсць за што!

Вы ўжо чулі, напрыклад, што жыхары гэтых мясцэчкаў (іх тут спрадвеку завуць каласкамі і калінкамі) садзяць бульбу ноччу і з рагаткі (каб жука абдурыць і зямлю не тапаптаць)? Тады ведайце, што, паводле прагнозаў (у прыватнасці, нашага падпісчыка спадара Міколы Горба з Малых Аўцюкоў), у бліжэйшыя гады яе і капаць будуць ноччу, каб гаспадар не злавіў. Вы яшчэ збіраецеся адкрыць «Салон прыгажосці»? А там ужо ёсць і працуе ён пад дэвізам: «Заходзьце і вы сябе не пазнаеце!» Вы недзе чыталі, што ў тамтэйшых краях ніхто гарэлкі не гоне, але многія прадаюць? То самая лепшая — ведайце — у мясцовага ўчастковага. Вы яшчэ думаеце, як гэта пахудзець, пастрыгчыся, «намаляваць на мордзе твар» і ў што б такое прыбрацца, а там ужо вынайшлі цудоўнае люстэрка, у якое зірнуў і суцешыўся (бо на ім напісана мудрае «Іншыя не лепшыя!»). Вы толькі зайшлі ў аптэку, убачылі цэны на лекі і тут жа выйшлі? Аўцюкі ж пасля гэтага завіталі ў краму «Рытуальныя паслугі», убачылі цэны там і вярнуліся назад... у аптэку. Вы яшчэ думаеце, ці трэба мераць сем разоў, калі будзеш рэзаць праўду-матку, а там...

Там (і ўжо даўно) напісалі правілы для аўцюкоўскіх гасцей. Паводле гэтага дакумента, усе госці (колькасць насельніцтва падчас фестывалю павялічваецца прыкладна ў тры разы) маюць права свабодна швэндацца па аўцюкоўскіх вуліцах, дыхаць гаючым аўцюкоўскім паветрам, быць аблічанымі і абважанымі ў аўцюкоўскіх крамах.

Яны, тыя ж госці, абавязаны потым не раз наведваць Аўцюкі, нават калі ім гэтага не хочацца, лічыць аўцюкоўцаў самароднымі і ўслаўляць іх паўсюль, дзе толькі можна...

Гэтым, апошнім пунктам з правілаў з найбольшай прыемнасцю кіруецца бацька-заснавальнік фестывалю народнага гумару, пісьменнік Уладзімір Ліпскі, а таксама шмат хто з каманды аднадумцаў. У прыватнасці, гасцямі папярэдніх фестываляў у Аўцюках былі слынныя Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін, Алесь Петрашкевіч, Мікола Чарняўскі, Віктар Казько, Анатоль Кудравец, Генадзь Аўсяннікаў, Міхась Дрынеўскі і многія, многія іншыя.

Аб тым, хто прыехаў гэтым разам, і што там было — у наступных нумарах «Звязды».

**Валянціна ДОЎНАР**